УДК 947.6

# ДА ПЫТАННЯ ГІСТАРЫЯГРАФІІ МЕТАДАЛОГІІ АРХЕАЛАГІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ БЕЛАРУСІ Ў XIX СТАГОДДЗІ

*канд. гіст. навук Д.У. ДУК*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*На падставе вывучэння гістарыяграфіі археалагічнага даследавання Беларусі XIX ст. разгледжана дынаміка развіцця археалагічнай метадалогіі: ад палявой часткі і камеральнай апрацоўкі да стварэння тэарэтычных высноў. Прапануецца вылучэнне асноўных этапаў развіцця метадалогіі археалагічнага даследавання Беларусі ў XIX ст.*

Тэрыторыя Беларусі належыць да рэгіёнаў, якія адносна добра вывучаныя ў археалагічным плане. Не ў малой ступені гэтаму спрыяла назапашванне археалагічных ведаў на працягу некалькіх стагоддзяў.

Станаўленне археалагічнай навукі на Беларусі прайшло доўгі шлях. Новы час (XIX ст.) стаў тым пераломным рубяжом, калі ад першаснага накаплення ведаў паступова адбываўся пераход да іх сістэматызацыі і навуковага асэнсавання. Гэта быў складаны працэс, у выніку якога ад спроб экстэнсіўнага накаплення археалагічнага матэрыялу, фактычна збіральніцтва і калекцыянавання, стала магчымым яго навуковая апрабацыя.

Станаўленне археалагічнай навукі ў XIX ст. можна падзяліць на тры ўмоўныя этапы. Першы этап – ад спроб пачатковага накаплення археалагічных ведаў у пачатку XIX ст. да адкрыцця Віленскага музея старажытнасцяў і дзейнасці Віленскай археалагічнай камісіі (1856 г.). Другі этап – дзейнасць Віленскага музея старажытнасцяў да 1864 г. і пасля яго закрыцця. Пачатак трэцяга этапа паклаў IX археалагічны з'езд у Вільні (1893 г.). На прыканцы XIX ст. распачынаецца навуковая дзейнасць вядомых даследчыкаў, пачынальнікаў беларускай і расійскай археалогіі XIX – пачатку XX ст. (Е.Р. Раманава, У.Г. Сізова, А.А. Спіцына і інш.).

Мэта дадзенай работы – вывучэнне асноўных этапаў у развіцці метадалогіі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. (у першую чаргу яе палявой і камеральнай часткі), вывучэнне асноўных этапаў і якасных змен у арганізацыі працэса археалагічнага даследавання. З улікам шматгаліновасці напрамкаў археалагічнага вывучэння Беларусі (асабліва ў другой палове XIX ст.), за аснову аналіза абраны сінтэзныя працы, якія адлюстроўваюць асноўныя этапы археалагічнага даследавання ад яго палявой часткі і камеральнай апрацоўкі да стварэння тэарэтычных высноў. Параўнанне метадалогіі навуковай фіксацыі і інтэрпрэтацыі археалагічнага матэрыялу XIX ст. дапасавана да прынцыпаў сучаснай метадалогіі археалагічнага даследавання.

Прапанаваны агляд асноўных напрацовак беларускай гістарыяграфіі не можа прэтэндаваць на вычарпальнасць, паколькі, па-першае, многія працы і напрамкі гістарыяграфічнай спадчыны ўжо з'яўляліся прадметам асобных выданняў, па-другое, далёка не ўсе напрацоўкі беларускіх даследчыкаў пазамінулага стагоддзя былі апублікаваны (варта ўзгадаць працы Ф. Вярэнькі па Ушаччыне, А.К. Кіркора па Гродзеншчыне, Е.Р. Раманава па Сенненшчыне і інш.)

Зараджэнне цікаўнасці да помнікаў археалогіі на Беларусі ў гістарычных крыніцах фіксуецца з XVI ст. [2, с. 7 – 15]. У пачатку XIX ст. ужо склалася пэўная сістэма ведаў, якая і прадвызначыла далейшыя накірункі развіцця археалогіі. Першыя крокі ў развіцці метадалогіі археалагічнага вывучэння Беларусі ў разглядаемы перыяд звязаны з імем Ф.Я. Нарбута (1784 – 1864 гг.).

Ф.Я. Нарбут першы зрабіў вызначэнне кургана як месца старажытнага пахавання, вёў раскопкі ў Падняпроўі, пазней – на радзіме, у Лідскім павеце [2, с. 21 – 22]. На сёняшні дзень не высветленым застаецца колькасць раскапаных Нарбутам курганоў, гэтак сама як і лёс археалагічных калекцый. Цікаўнасць Ф.Я. Нарбута да археалагічнай спадчыны Панямоння (у асноўным ён даследаваў курганы паміж Магілёвам і Рагачовам) у пачатку XIX ст. аб'ектыўна яшчэ не магла перарасці ў нешта большае за захапленне першаадкрыццём асобных помнікаў.

Ф.Я. Нарбут апісаў руіны крэпасці на Нёмане каля в. Лыскава, у 1820 г. адкрыў ямнае пахаванне недалёка ад в. Шаўры Лідскага павета [2, с. 22 – 23]. Нягледзячы на абмежаваныя і даволі наіўныя высновы, фрагментарнасць і безсістэмнасць раскопак, даследчык звярнуў увагу на галоўную акалічнасць: матэрыяльныя рэшткі, знойдзеныя ў зямлі, могуць служыць гістарычнай крыніцай. Аднак да карыстання гэтай крыніцай у гады жыцця Нарбута было яшчэ далёка. Падобныя пазіцыі ў рэгістрацыі помнікаў археалогіі адлюстраваны ў навуковай спадчыне З. Даленгі-Хадакоўскага [2, с. 41 – 45].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З. Даленга-Хадакоўскі (1784 – 1825 гг.) у 1818 г. першы з беларускіх навукоўцаў атрымаў Грамату (адкрыты ліст) на права правядзення археалагічных раскопак, выдадзеную Віленскім універсітэтам. У працы «Пра славяншчызну да хрысціянства» (1818 г.) ён падкрэсліў выключнае значэнне помнікаў археалогіі ў вывучэнні побыту і культуры продкаў [7, с. 123]. Ён аддаваў прыярытэт фіксацыі звестак пра нерухомыя артэфакты (могільнікі, пасяленні, архітэктурныя збудаванні), сабраў лексікон (слоўнік) назваў 7 тысяч урочышчаў, замаляваў сотні помнікаў археалогіі, адзін з першых выкарыстаў метады графічнай фіксацыі археалагічных аб'ектаў [7, с. 125]. Праблемы метадалогіі палявога археалагічнага даследавання ў працах З. Даленгі-Хадакоўскага не пазначаны.

Дзейнасць братоў Тышкевічаў паклала пачатак навуковаму этапу палявога археалагічнага вывучэння Беларусі. Старэйшы з братоў К.П. Тышкевіч (1806 – 1868 гг.) у 1857 г. прадпрыняў унікальнае вандраванне па рацэ Віліі (682 вярсты), вынікам якога стала публікацыя абагульняючай манаграфіі «Wilija i jej Brzegi» [26]. У гэтай кнізе адлюстраваны вынікі раскопак аўтара, якія ён праводзіў падчас вандравання. Даследаванне не ўтрымлівае падрабязнага апісання працэсу раскопак, яны, у асноўным, маюць ілюстратыўны характар да папулярных апавяданняў па гісторыі Віліўшчыны.

У працы «Wiadomośc historyczna o zamkach, horodyszczach i okopiskach starożytnych na Litwie i Rusi litewskiej» К.П. Тышкевіч зрабіў класіфікацыю даследаваных помнікаў з іх тапаграфічнымі планамі [2, с. 59]. Ва ўмовах адсутнасці падобнага роду даследаванняў работа К.П. Тышкевіча мела эклектычны характар: у адной класіфікацыі былі змешчаны розначасовыя гарадзішчы, заселеныя неаднародным па этнічнаму складу насельніцтвам. Як слушна заўважыў Л.В. Аляксееў, у эпоху жыццядзейнасці братоў Тышкевічаў ніякага ўяўлення аб культурным пласце яшчэ не існавала і сур'ёзнай спробы раскопак гарадзішчаў яшчэ ніхто не прадпрымаў [2, с. 59].

Даследчык упершыню звярнуў увагу на неабходнасць *навуковага* даследавання курганных могільнікаў. Адначасова з братам, Я.П. Тышкевічам (1814 – 1873), ён у 1833 – 1834 гг. пачаў весці раскопкі кurganоў на Лагойшчыне і раскапаў іх «сотні» [2, с. 59]. К.П. Тышкевіч зрабіў фармальную класіфікацыю гэтага тыпу пахавальнага помніка, з пункту гледжання сучаснай навукі даволі фантастычную. Курганы ён падзяляў на пяць груп – «асобна размешчаныя», «згрупаваныя», «старажавыя», «спадарожныя ці пуцявыя» [2, с. 59 – 60]. Тым не менш прынцыпы аб'ектыўнай неабходнасці ўдасканалення методыкі раскопак курганоў упершыню быў сфармуляваны менавіта ім. Мэта раскопак, паводле К.П. Тышкевіча, заключаецца ў тым, каб з дакладнасцю рассекчы культурныя напластаванні, якія павінны трапна вызначыць пласты, з якіх яны пабудаваны. Ён жа звярнуў увагу на неабходнасць дакладнага выбару месца будучага раскопа. Пры яго вызначэнні неабходна абапірацца на звесткі, атрыманыя ад мясцовага насельніцтва, у прыватнасці, для высвятлення пытання аб старажытнасці курганных могільнікаў, што з'яўляецца асноўным прынцыпам правядзення археалагічнай разведкі.

У сярэдзіне XIX ст. аматарскі характар археалагічнага даследавання ўжо не адпавядаў запатрабаванням часу. У выніку няўхільнага павышэння інтарэсу да археалагічных помнікаў (правядзенне памеснымі землеўладальнікамі раскопак), да сярэдзіны XIX ст. быў атрыманы вялікі корпус археалагічных крыніц, аднак дагэтуль не было магчымасці яго належнай класіфікацыі. Людзі, якія займаліся археалагічнымі даследаваннямі і сур'ёзна цікавіліся мінулым свайго краю, пачыналі разумець неабходнасць каардынацыі сваіх намаганняў і паступова прыходзілі да высновы аб дзяржаўным пачатку ў гэтай справе.

Першыя крокі ў гэтым накірунку былі зроблены братамі Тышкевічамі, якія звярнулі ўвагу на неабходнасць навуковага вывучэння не толькі курганных пахаванняў, але і паселішчаў. У сярэдзіне XIX ст. спробы навуковай класіфікацыі археалагічных артэфактаў яшчэ не маглі быць паспяховымі па аб'ектыўнай прычыне: станаўленне археалогіі як навукі яшчэ толькі пачыналася, і вялікую ролю ў гэтым працэсе адыграла адкрыццё Віленскага музея старажытнасцяў і Віленскай археалагічнай камісіі пры музеі.

Па меркаванню Л.В. Аляксеева, Я.П. Тышкевіч – першы з братоў, хто заклаў асновы сучаснай беларускай навуковай археалогіі [2, с. 61]. Праца жыцця Я.П. Тышкевіча – гэта стварэнне Віленскага музея старажытнасцяў і археалагічнай камісіі пры ім.

Праект гэтых устаноў быў распрацаваны ў 1851 г. Аляксандр II зацвердзіў «Палажэнне аб музеі старажытнасцяў… у Вільні» 29 красавіка 1855 г. [19, с. 7]. Справа адкрыцця Віленскага музея старажытнасцяў для айчыннай археалогіі можа быць параўнана па значнасці з адкрыццём Брытанскага музея для сусветнай археалогіі. Віленскі музей старажытнасцяў аб'яднаў зацікаўленых у развіцці айчыннай археалогіі людзей, спрыяў спалучэнню намаганняў усіх аматараў даўніны (уласна гісторыкаў і тых, хто цікавіўся выкапнёвымі старажытнасцямі). Галоўная заслуга Я.П. Тышкевіча – гэта стварэнне пастаянна дзейнічаючай археалагічнай камісіі пры музеі.

Такім чынам, 29 красавіка 1855 г. быў заснаваны, а 1 снежня 1856 г. быў адчынены ў будынку Віленскага універсітэта Віленскі музей старажытнасцяў. Музей і створаная пры ім Віленская археалагіч-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ная камісія з'яўляліся першымі навуковымі ўстановамі не толькі па каардынацыі намаганняў шматлікіх калекцыянераў і збіральнікаў даўніны, але і дзейснай арганізацыяй дзяржаўнага ўзроўню, якая забяспечвала кантроль над археалагічнай справай у паўночна-заходнім краі. Для разумення значэння дзейнасці Віленскага музея старажытнасцяў і Віленскай археалагічнай камісіі неабходна звярнуцца да праекта палажэнняў аднаведных устаноў.

Паводле Палажэння, стварэнне Віленскага музея ставіла мэтай «влияние мер правительственных на сохранение всех сих предметов[1] под руководством людей учёных и любознательных» [19, с. 2]. У лік сапраўдных членаў і супрацоўнікаў прымаліся мясцовыя ўладальнікі і ўвогуле людзі, якія маглі б садзейнічаць навуковым мэтам музея і камісіі матэрыяльнымі і грашовымі сродкамі [19, с. 3]. Усяго было абрана 15 сапраўдных членаў, якія набылі вядомасць вучонымі працамі па гісторыі, археалогіі і статыстыцы паўночна-заходняга краю, 9 членаў-супрацоўнікаў па частцы археалогіі і этнаграфіі, 18 членаў-благатварыцеляў. Усяго 51 чалавек пацверджаны ў званнях сапраўдных членаў упраўляючым Віленскай вучэбнай акругай, віленскім, гродненскім, мінскім і ковенскім генерал-губернатарам І.Г. Бібікавым і ўзнагароджаны дыпломамі.

Калекцыя, сабраная ў музеі, налічвала не толькі ўласна археалагічныя артэфакты. У музей былі перададзены калекцыі Я.П. і К.П. Тышкевічаў, У. Сыракомлі, А.К. Кіркора, Т.У. Нарбута, М.І. Балінскага, Ф.К. Багушэвіча, І.Р. Кулакоўскага, К.А. Буйніцкага, А.А. Плятара і інш. [19, с. 3]. У музеі было сабрана:

1) 3000 тамоў, прысвечаных старажытнасцям, гісторыі і бібліяграфіі, і 7000 тамоў, прывезеных са скасаваных уніяцкіх манастыроў мясцовых губерній;

2) калекцыя манет і медаляў, якая налічвала 3000 экзэмпляраў;

3) гравюр, палітыпажаў, геаграфічных карт і атласаў, медных гравіраваных дошак, колькасцю больш 1000 экзэмпляраў;

4) аддзяленне бюстаў, карцін і партрэтаў;

5) сабранне розных дыпломаў, старажытных рукапісаў, аўтографаў усіх караляваных асоб у Вялікім княстве Літоўскім ад Аляксандра (1492 г.) і амаль усіх больш вядомых асобаў у мясцовым краі. Асаблівую цікавасць уяўлялі пячаткі з гербамі амаль усіх шляхецкіх родаў краю, пячаткі розных гарадоў, манастыроў, прыходаў і г.д. Уласна археалагічная калекцыя налічвала больш 2000 прадметаў. З іх некалькі язычніцкіх ідалаў, слязніцы, тытуніцы, урны, розныя металічныя ўпрыгожанні старажытных славян і літоўцаў з курганных пахаванняў. Каменныя ядры з Віленскага Стара-Трокскага і Мінскага замка, каля 500 каменных молатаў мясцовых і каля 100 скандынаўскіх, прывезеных графам Тышкевічам са Швецыі «для параўнання», ваенны рыштунак, зброя наступальная і абарончая і інш. [19, с. 6 – 7].

Пералік калекцыі дазваляе сцвярджаць, што прыярытэтным накірункам з'яўлялася не толькі збіранне ўласна літоўскіх і беларускіх старажытнасцяў, але і старажытнасцяў суседніх земляў – традыцыя, якая цалкам упісваецца ў сусветную практыку.

Асаблівую цікавасць прадстаўляе праграма дзейнасці Віленскай археалагічнай камісіі. У станаўленні справы захавання і аховы археалагічнай спадчыны найбольш значнымі ўяўляюцца наступныя асноўныя напрамкі дзейнасці камісіі:

1) прыняцце мераў па ахове помнікаў падводнай археалогіі (11 пункт праграмы). На прыкладзе рэк Віліі і Нёмана падкрэслівалася, што донныя адклады гэтых валаёмаў утрымліваюць мноства язычніцкіх прадметаў. Камісія мусіць прыняць меры па ахове гэтых рэчаў пры мяркуемай ачыстцы русела рэк [19, с. 15].

Фактычна 11 пункт праграмы дзейнасці Віленскай археалагічнай камісіі з'яўляецца першым нарматыўным дакументам па ахове падводных помнікаў археалогіі на тэрыторыі Беларусі. Спробу ўзяць пад дзяржаўную ахову помнікі археалогіі нельга лічыць выключна дэкларацыйнай, паколькі адным з пачэсных сапраўдных членаў Віленскай археалагічнай камісіі абраны віленскі, гродзенскі і ковенскі генерал-губернатар У.І. Назімаў [19, с. 50];

2) пункт 12 прадугледжваў збор і сістэматызацыю археалагічных матэрыялаў паўночна-заходняга краю для складання слоўніка ўсіх археалагічных помнікаў [19, с. 15].

Асаблівую ўвагу камісія надавала аналізу тэндэнцый развіцця археалогіі ў іншых краінах (варта ўзгадаць даклад А.К. Кіркора «Значение и успехи археологии в наше время», прысвечаны аналізу стану вывучэння помнікаў археалогіі ў Еўропе, Амерыцы, Расіі, Літве і Беларусі) [9].

У 1865 г. дзейнасць Віленскага музея старажытнасцяў і археалагічнай камісіі пры ім была спынена, а калекцыі падвергнуты «рэвізіі». Пазней у значна рэканструяваным выглядзе музей праіснаваў да першай сусветнай вайны.

[1] Старажытных кніг, актаў, рукапісаў, манет, медаляў, зброі, надпісаў і здымкаў з іх па гісторыі паўночна-заходняга краю – *аўт.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разгром Віленскага музея старажытнасцяў не спыніў навуковай цікаўнасці да помнікаў археалогіі. Напрацоўкі гістарыяграфіі археалагічнага вывучэння Беларусі другой трэці XIX ст. зрабілі магчымым далейшае развіццё археалогіі на якасна вышэйшым узроўні, дзякуючы асобам К.А. Гаворскага, А.К. Кіркора, А.М. Семянтоўскага і інш.

Дзейнасць Віленскага музея аб'яднала шмат цікавых людзей, сярод якіх асаблівай увагі заслугоўвае творчая спадчына А.К. Кіркора (1818 – 1886). Даследчык пакінуў шмат прац па геаграфіі, этнаграфіі, гісторыі Беларусі, не менш значныя даследаванні належаць яму як археолагу. З пункту гледжання развіцця метадалогіі археалагічнага даследавання. А.К. Кіркор упершыню на Беларусі прымяніў больш прагрэсіўную методыку раскопак курганоў траншэямі крыж-накрыж (у адрозненні ад традыцыйнай для XIX ст. тэхнікі ракопак калодзежам). Насып пры раскопках траншэямі крыж-накрыж ускрываўся амаль цалкам і спрыяў больш дэталёваму даследаванню курганнага насыпа з магчымасцю фіксацыі профіля раскопа. Безумоўную цікавасць уяўляюць погляды вучонага на прызначэнне гарадзішчаў, ён уводзіць падзел на тры групы – месцы пасялення, сховішчы, свяцілішчы. На жаль, да нашых дзён не захаваліся палявыя дзённікі раскопак курганоў, паколькі сапраўдная колькасць раскапаных А.К. Кіркорам курганоў у Ашмянскім, Барысаўскім, Вілейскім, Віленскім, Лідскім, Мінскім, Навагрудскім, Свянцянскім, Трокскіх і іншых паветах больш за тысячу [8, с. 326].

У методыцы датавання курганоў А.К. Кіркор звярнуў увагу на час распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях. Такім чынам, ён даводзіць думку, што XI ст. (адпраўная кропка распаўсюджвання хрысціянства паводле Кіркора) праводзіць падзел паміж язычніцкімі і хрысціянскімі курганнымі насыпамі [7, с. 56]. Аднак да комплекснага выкарыстання нумізматычных, сфрагістычных і іншага корпуса археалагічных крыніц як надзейнага храналагічнага індыкатара А.К. Кіркор яшчэ не звяртаўся.

Даволі шматгранная з'яўляецца творчая спадчына К.А. Гаворскага (1821 – 1871). Уласна палявыя археалагічныя даследаванні К.А. Гаворскага зводзяцца да ўдзелу ў раскопках дзесяці курганоў у ваколіцах Полацка. Яго сціслая публікацыя вынікаў раскопак курганоў уяўляе безумоўную цікавасць з гледжання методыкі апісання [5]. Фактычна К.А. Гаворскі з'яўляецца першым з айчынных даследчыкаў, хто звярнуў увагу на тэхніку будаўніцтва і этапы ўзвядзення кургана. У распрацоўцы методыкі палявога археалагічнага даследавання Гаворскі прыйшоў да неабходнасці вызначэння і фіксацыі:

1) памераў курганнага насыпу і колькасці пахаваных;
2) асаблівасцяў размяшчэння рэштак пахавання (крэмацыі) у насыпу ці на гарызонце;
3) інвентара пахаванняў (рэшткі рытуальнага посуду);
4) рэканструкцыі пахавальнага абраду (засыпанне рэштак трупаспалення непасрэдна на месцы крэмацыі).

Такім чынам, К.А. Гаворскі наблізіўся да выключна археалагічных абагульненняў у апісанні вынікаў раскопак. Не вядома, ці была праведзена графічная фіксацыя працэсу раскопак, прынамсі, звестак аб ёй у працах аўтара не сустракаецца.

Заслугоўвае ўвагу гісторыка-архітэктурнае даследаванне Барысаглебскага манастыра ў Полацку. Акрамя цікавейшых гістарычных звестак з манастырскага архіва, Гаворскі прыводзіць дадзеныя аб намерах плінфы і сістэме муроўкі манастырскіх збудаванняў [2, с. 92]. Гэтую тэму ў вывучэнні полацкага манументальнага дойлідства ў другой палове XIX ст. развіў у сваёй працы А.М. Паўлінаў, які зрабіў першыя абмеры полацкіх і віцебскіх цэркваў: Полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай, храмаў Бельчыцкага манастыра (асаблівая ўвага ім надавалася Вялікаму сабору), Сафійскага сабора, Віцебскай Благавешчанскай царквы [13]. Асабліва важным прадстаўляецца naзіранне навукоўца аб падабенстве Спаса-Ефрасіннеўскай царквы з Віцебскай Благавешчанскай царквой. Як трапна заўважае Л.В. Аляксееў, «после А.М. Павлинова исследование древней архитектуры Полоцкой земли стало на научные рельсы» [2, с. 137].

Асаблівае месца ў гісторыі айчыннай археалогіі належыць А.М. Семянтоўскаму (1821 – 1893). Варта адзначыць, што А.М. Семянтоўскі асабіста раскопкамі не займаўся, але сачыў за даследаваннямі беларускіх археолагаў. Шэраг навуковых прац прысвяціў помнікам Беларусі. Апісаў Барысавы камяні, Віцебскую Благавешчанскую царкву, Полацкі Сафійскі сабор, Вялікі сабор у Бельчыцах. Вывучаў старажытныя помнікі, археалагічныя знаходкі, крыж Ефрасінні Полацкай і інш. Сабраў звесткі пра 30 замкаў і замчышчаў Віцебшчыны, вёў улік помнікаў па кожнаму павету Віцебскай губерні і фіксаваў іх на археалагічнай карце. Археалагічныя аб'екты падзяліў на шэраг груп паводле прызначэння.

У 1890 годзе А.М. Семянтоўскі перавыдае сваю манаграфію «Памятники старины Витебской губернии» (1867) [21] у сінтэзнай працы «Белорусские древности» [22]. Даследчык прымеркаваў выхад «Беларускіх старажытнасцяў» да IX археалагічнага з'езда ў Вільні. Аднак кніга не была прынята сучаснікамі, бо па зместу гэта была тая ж кніга 1867 г., і нягледзячы на дапаўненні, даследчыцкі ўзровень выдання застаўся ранейшым [2, с. 99].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У працах А.М. Семянтоўскага падаюцца звесткі аб 1200 раскапаных курганах Віцебскай губерні [21, 22]. Схема апісання асобных курганоў больш падобная на этнаграфічныя замалёўкі, чым на археалагічнае даследаванне. Уласна археалагічнае апісанне зводзіцца да наступнай схемы:

1. Пазначэнне ўдзельнікаў экспедыцыі.

Падаецца ў форме апавядання, без дакладнага пазначэння, напрыклад: «7.07.1884 я (А.М. Семянтоўскі – *аўт.*) и мой сосед при участии некоторых любителей старины произвели раскопку одного из некоторых в середине групы лежащих курганов, находящегося близ него вала, и наконец докончили раскопку одиночного кургана на земле В.А. Дзедзеля, на пути в имение Устье» [22, с. 20].

2. Пазначэнне знешняга выгляду кургана (памеры, форма).

Гэтая важная частка палявога археалагічнага даследавання ў працы А.М. Семянтоўскага адзначаецца даволі ўмоўна (схема «вялікі – малы», «круглы – падоўжаны», «востраканечны» [22, с. 15 – 20]), а часам ўвогуле адсутнічае.

3. Фіксацыя этнаграфічнага матэрыялу.

Неабходная ўмова правядзення археалагічных разведак, аднак у А.М. Семянтоўскага падаецца без крытыкі, уся інфармацыя ўспрымаецца на веру. Напрыклад, народныя павер'і пра скарбы ў магілах напрамую пераносяцца ў навуковае выданне («слиток серебра с головку капусты», пра знаходкі ў курганах срэбраных талерак і лыжак: «можно думать, что рассказы эти не лишены основания») [22, с. 3, 5]. Некрытычнае стаўленне да народных паданняў прыводзіла да істотных памылак у вызначэнні археалагічных помнікаў. У працы А.М. Семянтоўскага часта блытаюцца звесткі пра гарадзішчы і курганы (гарадзішча ва ўрочышчы Кабыліца сучаснага Гарадоцкага раёна пазначаецца як курган, са слоў мясцовых жыхароў) [22, с. 5].

4. Апісанне стратыграфіі помнікаў.

У пераважнай большасці выпадкаў адсутнічае, ці падаецца даволі ўмоўна. Напрыклад, у кургане ля вёскі Вусце, паводле А.М. Семянтоўскага, знойдзены два гаршчкі на глыбіні паўаршына ад паверхні, дробныя паўспарахнеўшыя косткі, сярод якіх дзве чалавечыя каленныя чашачкі [22, с. 20].

5. Улік і апісанне знаходак.

Прыведзена графічныя выявы асобных рэчаў, іх апісанне зроблена без атрыбутыкі і храналагічнай прывязкі [22, с. 15]. Аднак у «Беларускіх старажытнасцях» шырока прымяняецца параўнаўчы метад для высвятлення этнічнага індыкатара рэчы з этнаграфічным матэрыялам XIX ст., што дае станоўчыя вынікі. Напрыклад, А.М. Семянтоўскім дакладна вызначана этнічная прыналежнасць балцкіх падкованападобных спражак [22, мал. 1 – 3].

Ва ўмовах адсутнасці распрацаванай перыядызацыі каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў, безумоўную важкасць мае публікацыя амаль адначасова з М.Ф. Кусцінскім тыпалогіі рэчаў з курганных могільнікаў Лепельскага павета з вызначэннем іх першаснай храналагічнай атрыбутыкі. А.М. Семянтоўскі – першы айчынны даследчык, які прымяніў метад датавання па комплексу датуючых знаходак з курганоў XVI ст. Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У пахавальным інвентары гэтых курганоў адзначаны знаходкі манет Жыгімонта Аўгуста 1569 г. [22, с. 28].

Скарбашукальніцтва ў XIX ст. стала з'явай масавай, на што не мог не звярнуць увагу А.М. Семянтоўскі і іншыя даследчыкі: «з 19 курганоў ля вёскі Свірыдаўка, – адзначае Семянтоўскі, – 7 цэлых, 12 раскапана скарбашукальнікамі» [22, с. 28].

Цікавыя занатоўкі аб разбурэнні курганоў скарбашукальнікамі прыводзіць Ф.В. Пакроўскі (1855 – 1893). Так, падчас даследаванняў браслаўскіх курганоў экспедыцыяй Пакроўскага сустрэты пехта Далецкі са шчупам у руках. Па словах мясцовых сялян, гэты чалавек быў апантаны скарбашукальніцтвам і сапсаваў у ваколіцах Браслава шмат курганоў [18, с. 176 – 180].

У цэлым творы А.М. Семянтоўскага і зараз маюць практычнае значэнне – яны даволі інфарматыўныя ў апісанні асобных археалагічных помнікаў. Аднак некрытычнае стаўленне да народных паданняў і з улікам той акалічнасці, што многія помнікі з часоў жыццядзейнасці Семянтоўскага проста перасталі існаваць, зараз не заўсёды ўдаецца скласці карціну аб'ектыўна існаваўшай рэальнасці.

Багатую археалагічную спадчыну вядомага беларускага гісторыка Г.Х. Татура (1846 – 1907) цяжка аднесці да якой-небудзь школы ці напрамка. Асноўная праца Г.Х. Татура «Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ея археологическое значение» створана на вялікай крыніцазнаўчай базе [23]. Г.Х. Татур – адзін з буйнейшых палявых археолагаў Беларусі XIX ст. «Нарыс» Г.Х. Татура створаны на падставе вывучэння вялікай колькасці курганных насыпаў. Археалагічныя помнікі ў «Нарысе» сістэматызаваны і прадстаўлены ў наступных групах:

1) земляныя насыпы;
2) каменныя помнікі;
3) помнікі з надпісамі і выявамі;
4) помнікі без надпісаў і выяў;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5) каменныя прылады працы;
6) помнікі з металаў;
7) падводныя свайныя пабудовы;
8) дарогі, пляціны, масты і інш. [23].

У рабоце апісваюцца гарадзішчы, аднак без якой-небудзь прывязкі да этнасу насельнікаў, адсутнічае вызначэнне часу існавання. Добра падаюцца апісанне знешніх прыкмет помнікаў, наяўнасць валоў, ірвоў і інш. Спроба класіфікацыі курганоў, хаця і прадстаўляе цікавасць, з'яўляецца даволі наіўнай. Курганы Г.Х. Татур падзяляе на памятныя (кенатафы), ваенныя (з пахаваннямі загінуўшых воінаў падчас бітвы), трунавыя (з рознымі пахаваннямі ў пабудовах) [23, с. 24 – 27]. Практычнае значэнне твора Г.Х. Татура на сённяшні дзень мінімальная, паколькі аўтарская інтэрпрэтацыя безумоўна дамінуе над навуковай фіксацыяй.

Вызначэнню гістарычнай ролі археалагічных помнікаў удзелена асаблівая ўвага ў творчай спадчыне Ф.В. Пакроўскага. Таленавіты арганізатар Ф.В. Пакроўскі склаў археалагічныя карты Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў [14, 15, 16], дакладнасць прыведзеных звестак неаднаразова пацвярджалася [2, с. 153]. Гэты факт прадстаўляецца асабліва важным, улічваючы знішчэнне многіх помнікаў археалогіі ў XX ст. Ф.В. Пакроўскі прымаў актыўны ўдзел у рабоце IX археалагічнага з'езда ў Вільні.

Фактычна працы Ф.В. Пакроўскага ўтрымліваюць першае навуковае апісанне як самога працэсу раскопак, гэтак і яго вынікаў [17, 18]. Заслугоўвае ўвагі параўнаўчы аналіз сучаснай структуры публікацыі асноўных этапаў раскопак са структурай Ф.В. Пакроўскага. Аналіз праведзены на падставе апісання раскопак курганоў Дзісненскага павета, паводле працы Ф.В. Пакроўскага «Курганы на границе современной Литвы и Белоруссии» [18, с. 166 – 167]. Праца змяшчае:

1) дакладнае вызначэнне фізічных межаў даследуемага раёна паміж Дзісной і Заходняй Дзвіной;
2) лакалізацыю мяжы паміж двума рознымі курганнымі тыпамі пахаванняў;
3) пазначэнне аб'ёму даследаванняў (колькасць раскапаных курганоў).

Схема апісанняў створана па прынцыпу: «Курган № 1 (Загорская група – *аўт.*) у акружнасці складае 32 шагі. Папярэчнік (праз верх) 4 сажані. Вышыня над узроўнем глебы 1 аршын 10 вяршкоў. Каля кургана, пры яго аснаванні, пяць трохкутных ям на прыблізна аднолькавай адна ад адной аддегласці. У аснове кургана – пласт белага пяску і на ім заметны вугальны пласт. Такі ж вугальны пласт заўважаны пасярэдзіне насыпу кургана. Глеба насыпу – аднародны з суседняю глебаю жоўты пясок» [18, с. 167].

Пры ўсім схематызме апісання нельга не звярнуць увагу на зацікаўленасць археолага палявой часткай даследавання. У Пакроўскага мэта раскопак ужо далёка не пошук рэчаў, а складаны працэс занатавання дадзеных аб прыналежнасці помніка, яго пабудовы, комплексны характар атрымання інфармацыі. Нельга не заўважыць, што ў дадзеным выпадку археолага не столькі цікавіць пытанне прысутнасці ў кургане рэчаў, колькі канструкцыя самаго помніка і яго навуковая фіксацыя (з улікам магчымасцяў археалагічнай навукі канца XIX ст.).

Стратыграфія помнікаў абавязкова пазначаецца, хаця часам апісанне не пазбаўлена схематызму. Адсутнічаюць графічныя планы і карты прывязкі курганных груп, няма ў працы і стратыграфічных прарысовак. Апісанне рэшткаў крэмацыі – схематычнае.

Апісанне знойдзеных рэчаў з курганоў – выключна вярбальнае, адсутнічаюць графічныя малюнкі артэфактаў. Зроблена фотафіксацыя асобных вырабаў, аднак без маштабу. Тым не менш у цэлым апісанне рэчавых комплексаў можна лічыць даволі падрабязным. Аўтар прыводзіць звесткі аб знешнім выглядзе, памерах, форме і матэрыялу, з якога зроблены той ці іншы артэфакт. На жаль, такая мадэль апісання не несе амаль ніякай інфармацыйнай нагрузкі ў апісанні, напрыклад, керамікі – аднаго з галоўных этнавызначальных індыкатараў. Інфармацыя аб далейшым лёсе артэфактаў адсутнічае.

Апісанне кожнай з курганных груп дапаўняецца высновамі, гэта значыць аўтарская інтэрпрэтацыя не папярэднічае навуковай фіксацыі. У высновах, як правіла, добра ілюструецца комплекс рэчаў з кургана, кожны комплекс апісваецца асобна. Такі падыход мае безумоўную важкасць для высвятлення этнічнай атрыбутыкі помнікаў, іх храналогіі. Аднак так далёка высновы аўтара яшчэ не прасунуліся, вызначэнне этнічнай прыналежнасці помнікаў – справа археолагаў першай паловы XX ст.

У гэтай сувязі важкім прадстаўляюцца высновы Ф.В. Пакроўскага па выніках вывучэння загорскіх курганоў: «Точных хронологических данных ни одним из раскопанных курганов не было представлено. Нет также достаточных оснований и для аналогического определения времени происхождения могильника: добытые раскопкою предметы и немногочисленны, и по своей форме настолько стереотипны, что могут находить аналогичные для себя предметы на протяжении многих веков железного периода... Не подлежит сомнению только один факт, что Загорские курганы бесспорно дохристианских времён своей местности... не позднее XI в.» [18, с. 175 – 176].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прапанаваная схема апісання раскопак курганных груп стала прыярытэтнай падчас працы IX археалагічнага з'езда ў Вільні. Аналагічная схема прадстаўлена ў работах М.В. Фурсава [25], У.З. Завітневіча [6]. М.В. Фурсаў нават пашырае вышэйпазначаную схему. У яго рабоце інфармацыя аб раскопках курганоў у Магілёўскай губерні структуравана наступным чынам:

1) прапануецца інфармацыя аб арганізатарах і кіраўніках экспедыцыі (Фурсаў, Чалоўскі) [25, с. 236];

2) пазначана метадалогія (паводле Інструкцыі Д.Я. Самаквасава для I Антрапалагічнага з'езда ў Маскве, 1878 г.);

3) дзённік раскопак Фурсава надрукаваны ў 1892 г. і перададзены ў Імператарскае Археалагічнае Таварыства (Масква), археалагічным таварыствам пры універсітэтах і членам IX археалагічнага з'езда ў Вільні. Далзеныя, якія змяшчае дзённік, датычацца:

- форм і склада курганных насыпаў;
- тыпаў пахаванняў;
- прадметаў з хатняга побыту, упрыгожанняў і прылад працы.

Асноўная навуковая дзейнасць буйнейшага палявога археолага Е.Р. Раманава (1855 – 1922) прыходзіцца на пачатак XX ст., тым не менш творчая пазіцыя вучонага склалася менавіта напрыканцы XIX ст. Адно з найбольш выдатных яго адкрыццяў – Люцынскі могільнік тагачаснай Віцебскай губерні. У справе вывучэння беларускіх помнікаў археалогіі Е.Р. Раманаў вызначыўся таксама адкрыццём Барысавага каменя (помнік эпіграфікі XII ст.), даследаваў археалагічныя помнікі Падняпроўя і Пасожжа. Удзельнічаў у адкрыцці IX археалагічнага з'езда ў Вільні.

Першыя ў гісторыі Беларусі экстранныя выратавальныя раскопкі былі праведзены Е.Р. Раманавым на Люцынскім могільніку. Неабходна падкрэсліць, што практыка выратавальных раскопак, якая заканадаўча афармлена ў нашы дні, на той час у Расійскай Імперыі была з'явай не вядомай. Е.Р. Раманаву па праву належыць заслуга па выратаванню унікальнага помніка археалогіі. Грунтовыя пахаванні (з якіх складаецца Люцынскі могільнік), у адрозненні ад курганоў, не маюць знешніх прыкмет, таму традыцыйная метадыка пошуку і раскопак з частковым раскрыццём культурнага пласта ў дадзеным выпадку ўжо не спрацоўвала. Сутнасць методыкі раскопак, якая была прыменена Е.Р. Раманавым падчас даследавання Люцынскага могільніка, па сутнасці мала чым адрознівалася ад сучаснай:

- спачатку ажыццяўлялася здымка з паверхні глебы «на штык», паласой шырынёй прыблізна ў аршын. Наступны этап – гэта зачыстка глебы для выкрыцця пахаванняў. Пры адсутнасці слядоў пахавання (плямы, зольных прапластак і г.д.) глеба дадаткова здымалася яшчэ на адзін – два штыкі. Адпрацаваная глеба пераносілася «на перавал», гэта значыць на месца былога раскопу;

- падчас раскопак праведзена апісанне стратыграфіі Люцынскага могільніка (урочышча Камарова гара), аднак даволі схематычна: «верхні пласт заключаў у сабе пясок з глінай, а ніжні – чыстую, шчыльную гліну, у ёй і знаходзіліся пахаванні» [11, с. 3];

- Е.Р. Раманаў вёў палявы дзённік, які састаўлены на прынцыпу вярбальнага апісання: а) палажэння касцяка і глыбіні яго залягання; б) арыентацыі па баках свету; в) асобных рэчаў [11, дадатак, с. 1 – 36].

- матэрыялы экспедыцый Е.Р. Раманава і У.І. Сізова былі перададзены ў Імператарскі Эрмітаж, находкі Раманава – ў Віленскі музей (Раскоп – II) і Маскоўскі гістарычны музей (Раскоп – III). У Маскоўскі гістарычны музей былі перададзены таксама знаходкі Сізова. Такім чынам, матэрыялы унікальнага грунтовага могільніка апынуліся ў трох розных установах, што, натуральна, не спрыяла захаванасці калекцый;

- памеры могільніка высветлены экспедыцыяй У.І. Сізова па замове Імператарскага гістарычнага музея. Раманавым было ўскрыта 293 пахавання (ускрытая плошча – 812 квадратных сажняў), Сізовым – 45.

Е.Р. Раманаў падкрэсліваў, што публікацыя дзённікаў раскопак праводзілася без інтэрпрэтацыі этнічнага, тыпалагічнага, храналагічнага і іншага паходжання саміх рэчаў, што (лічыў даследчык) зусім іншая задача [11, с. 4]. Гэтая думка Раманава з'яўлялася прагрэсіўнай для свайго часу. Ён жа вызначыў папярэдняе датаванне Люцынскага могільніка X – XI стст. і этнічную прыналежнасць да племені ліваў [11, с. 4]. Праца і сёння не страціла навуковай вартасці па прычыне ілюстратыўнасці, доказнасці высноў і падрабязнага апісання пахавальных комплексаў.

Матэрыялы У.І. Сізова «Справаздачы аб раскопках на Камаровай гары паблізу Люцына», змешчаныя разам з матэрыяламі Е.Р. Раманава, маюць выгляд публікацыі і ўтрымліваюць элемент аўтарскай інтэрпрэтацыі [11]. Справаздача суправаджаецца пералікам прадметаў, знойдзеных на Люцынскім могільніку, аднак у ёй бракуе апісання саміх прадметаў.

Пры непасрэдным кіраўніцтве Е.Р. Раманава былі даследаваны археалагічныя помнікі ў Спінах, Вядны, Лукомлі, Закур'і, Чэрцах Сенненскага павета, аднак поўнай публікацыі іх не адбылося [1, с. 289 – 291]. Збіранне матэрыялаў да IX археалагічнага з'езда прадугледжвала выданне археалагічнай карты Віцебскай губерні (надрукаваны часткова ў працы А.П. Сапунова «Река Западная Двина») [20, примечания 202, 206, 247].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларусь у другой палове XIX ст. перажывала перыяд «антыкварыянізму» – той самай з'явы, якая набыла вялікі размах у Еўропе з часоў Рэфармацыі і спрыяла інстытуцыялізацыі археалогіі як самастойнай навукі. Калекцыянаванне на землях Беларусі, як і паўсюдна, мела крайнія праявы: злоўжыванне калекцыянерамі ў справе падробкі рэчаў, іх куплі-продажы і г.д. Аб недапушчальнасці падобных праяў не раз выказваліся многія аўтары (Ф.В. Пакроўскі, А.М. Семянтоўскі, Е.Р. Раманаў) [11, с. 32; 18, с. 24; 21, с. 84].

Станаўленне кожнай навукі, у тым ліку археалогіі, – гэта доўгі і складаны працэс. У XIX ст. на Беларусі былі выпрацаваны і адлюстраваны асноўныя прынцыпы палявой археалагічнай практыкі – ад апісання вынікаў першых аматарскіх раскопак (Ф.Я. Нарбут, А.М. Семянтоўскі, Г.Х. Татур і інш.) да ўнармаванай сістэмы фіксацыі працэсу раскопак курганоў і грунтовых могільнікаў (К.А. Гаворскі, У.З. Завітневіч, Ф.В. Пакроўскі, Е.Р. Раманаў, У.І. Сізоў, М.В. Фурсаў і інш.). Пры гэтым да апошняй трэці XIX ст. методыка раскопак гарадзішчаў і курганоў не знайшла адлюстраванне ў гістарыяграфіі, фактычна была абмежаваная апісаннем гарадзішчаў і ўрочышчаў і зборам этнаграфічнага матэрыялу (З. Даленга-Ходакоўскі, А.М. Семянтоўскі, К.П. Тышкевіч). На прыканцы XIX ст. з'явіліся і першыя спробы апісання помнікаў архітэктурнай спадчыны, перш за ўсё храмавай візантыйскай традыцыі (К.А. Гаворскі, А.М. Паўлінаў, А.М. Семянтоўскі).

Многія напрацоўкі папярэдніх гадоў сталі вызначальнымі ў развіцці беларускай археалогіі пачатку XX ст. У прыватнасці, у пачатку XX ст. у палявой практыцы замацавалася методыка раскопак курганоў траншэямі крыж-накрыж (творчая спадчына А.К. Кіркора). Працягвалі навуковую дзейнасць вядомыя даследчыкі, сярод якіх Е.Р. Раманаў і У.І. Сізоў. Яны і іх вучні ў 20-х гадах XX ст. заклалі асновы развіцця археалагічнай навукі ў БССР.

## ЛІТАРАТУРА


1. Алексеев Л.В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины (материалы к археологической карте Витебской области БССР) // Вопросы этнической истории народов Прибалтики. – М.: Изд-во АН СССР, 1959. – С. 273 – 313.
2. Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Под ред. Б.А. Рыбакова. Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
3. Алексеев Л.В. Очерк истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х годов XIX в. // Советская археология. – 1967. – № 4. – С. 146 – 163.
4. Гетаў В.В., Штыхаў Г.В. Археалогія Беларусі // Археалогія і нумізматыка Беларусі. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 1993. – С. 7 – 15.
5. Говорский К.А. Поездка (14 сентября 1852 г.) из г. Полоцка по направлению так называемой Ольгердовой дороги // Записки Императорского археологического общества. – СПб. – 1853. – Т. V. – С. 88 – 97.
6. Завитневич В.З. Формы погребального обряда в Могилёвских курганах Минской губернии // Труды IX Археологического съезда в Вильне 1893 / Под ред. граф. Уваровой и С.С. Слуцкого: В 2 т. Т. I. – М.: Типография Э. Лиснера и Ю. Романа, 1895. – С. 221 – 235.
7. Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 124 с.
8. Каханоўскі Г.А., Кіркор А.К. Археалогія і нумізматыка Беларусі. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 1993. – 326 с.
9. Киркор А.К. Значение и успехи археологии в наше время // Записки Виленской археологической комиссии. Ч. I / Под ред. А.К. Киркора и М. Гусева. – Вильня: Друк. I. Завадского, 1856. – С. 25 – 39.
10. Киркор А.К. Белорусское Полесье // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / Под общ. ред. П.П. Семёнова. – Т. III, Ч. 2. – М.: Издание типографа-книгопродавца М.О. Вольфа, 1882. – С. 235 – 490.
11. Люцинский могильник // Материалы по археологии России, издаваемые Императорскою археологическою комиссиею № 14. / Древности северо-западного края. Т. I. Вып. 2. – СПб.: Типография Главного Управления Уделов, 1893. – 83 с.
12. Марзалюк І.А. Еўдакім Раманавіч Раманаў – археограф і археолаг Магілёўшчыны // Магілёўская даўніна. – Магілёў, 1993. – С. 37 – 45.
13. Павлинов А.М. Древние храмы Витебска и Полоцка // Труды IX археологического съезда в Вильне 1893. Под ред. граф. Уваровой и С.С. Слуцкого: В 2 т. Т. I. – М.: Типография Э. Лиснера и Ю. Романа, 1895. – С. 1 – 18.
14. Покровский Ф.В. К исследованию бассейна Вилии в археологическом отношении. – М.: Типография Лихтнера, 1899. – 156 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15. Покровский Ф.В. Археологическая карта Виленской губернии. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1893. – 193 с.
16. Покровский Ф.В. Археологическая карта Гродненской губернии. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1895. – 165 с.
17. Покровский Ф.В. К исследованию курганов и городищ на восточной окраине современной Литвы // Труды IX археологического съезда в Вильне, 1893 / Под ред. граф. Уваровой и С.С. Слуцкого: В 2 т. Т. 2. – М.: Типография Э. Лиснера и Ю. Романа, 1897. – С. 138 – 196.
18. Покровский Ф.В. Курганы на границе современной Литвы и Белоруссии // Труды IX археологического съезда в Вильне, 1893 / Под ред. граф. Уваровой и С.С. Слуцкого. В 2 т. Т. 1. – М.: Типография Э. Лиснера и Ю. Романа, 1895. – С. 166 – 220.
19. Программа действий Виленской ахеологической комисии // Записки Виленской археологической комиссии. Ч. I / Под ред. А.К. Киркора и М. Гусева. – Вильня: Друк. I. Завадского, 1856. – С. 7 – 15.
20. Сапунов Л. Река Западная Двина. Историко-географический обзор. – Витебск: Типолитография Г.А. Малкина, 1893. – 512 с; [LXIX] [3].
21. Сементовский А. Памятники старины Витебской губернии. – СПб: Типография К. Вульфа, 1867. – 74 с.
22. Сементовский А.М. Белорусские древности. Вып. I. – СПб.: Типолитография Н. Стефанова, 1890. – 136 с.
23. Татур Г.Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ея археологическое значение. – Мн.: Губернская типография, 1892. – 276 с.
24. Тышкевич К. Раскопки курганов в Минской губернии // Виленский вестник. – 1867. – № 20. – С. 2.
25. Фурсов М.В. Курганные раскопки в пяти уездах Могилёвской губернии в 1892 г. // Труды IX археологического съезда в Вильне, 1893 / Под ред. граф. Уваровой и С.С. Слуцкого: В 2 т. Т. 1. – М.: Типография Э. Лиснера и Ю. Романа, 1895. – С. 236 – 245.
26. Tyszkiewicz K.H. Wilija i jej Brzegi. – Drezno: Drukiem i nakladem J.I. Kraszewskiego. – 1871. – 362 s.

Электронный архив бибилиотеки МГУ имени А.А. Кулешова